# ФІЛАСОФІЯ

Весці БДПУ. Серыя 2. 2020. № 2. С. 113–115

*УДК 796.011*

*UDC 796.011*

## ФІЗІЧНАЯ КУЛЬТУРА І СПОРТ ЯК ПАНЯЦЦІ САЦЫЯЛЬНА-ФІЛАСОФСКАЙ АНТРАПАЛОГІІ

## PHYSICAL CULTURE AND SPORTS AS THE NOTIONS OF SOCIAL-PHILOSOPHICAL ANTHROPOLOGY

**Т. М. Буйко,**
*доктар філасофскіх навук, дацэнт, загадчык кафедры філасофіі і гісторыі БДУФК*

**T. Bouiko,**
*Doctor of Philosophy, Associate Professor, Head of the Department of Philosophy and History, BSUPC*

Паступіў у рэдакцыю 26.03.20.

Received on 26.03.20.

Вызначэнні фізічнай культуры і спорту ўяўляецца мэтазгодным будаваць на падставе цялесна-арыентаванага падыходу, які з’яўляецца сёння актуальным як у філасофскай антрапалогіі, так і ў сацыягуманітарным навуковым пазнанні наогул. Увядзенне паняцця цела ў сферу філасофіі і сацыяльна-гуманітарнага пазнання, а таксама распрацоўка паняцця цялеснасці дазваляюць убачыць у фізкультурна-спартыўнай дзейнасці асобую форму актыўнасці чалавека, якая ўяўляе сабой інтэгральнае выражэнне яго культурных дасягненняў, найважнейшы спосаб іх росту і трансляцыі. Вынікам такога падыходу з’яўляецца філасофска-антрапалагічнае вызначэнне фізкультурна-спартыўнай дзейнасці як культурабудавання і чалавекатворчасці.

*Ключавыя словы:* фізічная культура, спорт, цялеснасць, сацыяльна-філасофская антрапалогія, паняцце, цялесна-арыентаваны падыход.

The definitions of physical culture and sports are to be built on the base of corporality-oriented approach which is relevant nowadays both in philosophical anthropology and socio-humanitarian scientific cognition in general. Introduction of the notion of body into the sphere of philosophy and socio-humanitarian cognition as well as working out the notion of corporality allow to see the physical-sporting activity as a special form of human activity which presents the integral expression of their cultural achievements, the most important way of their growth and transmission. The result of such approach is the philosophical-anthropological definition of physical-sporting activity as culture-building and human creativity.

*Keywords:* physical culture, sports, corporality, social-philosophical anthropology, notion, corporality-oriented approach.

*Уводзіны*. Кафедра філасофіі і гісторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры ў 2016–2020 гг. выконвае навукова-даследчую работу па тэме «Фізічная культура і спорт Беларусі ў сацыяльна-палітычных працэсах XX–XXI стагоддзяў». Пры гэтым узаемасувязь фізічнай культуры і спорту разглядаецца намі традыцыйна: спорт – «састаўная частка фізічнай культуры, сродак і метад фізічнага выхавання, які мае на мэце развіццё і ўмацаванне арганізма чалавека, дасягненне ім высокіх вынікаў у спаборніцтвах» [1]. Ажыццяўляючы даследаванне нацыянальнай гісторыі фізічнай культуры і спорту, мы, разам з тым, спадзяёмся, што яго вынікі будуць спрыяць і распрацоўцы філасофска-антрапалагічнай канцэпцыі фізічнай культуры і спорту, якая павінна быць упісана ў агульную, сацыяльна-філасофскую тэорыю культуры.

*Асноўная частка.* Як адзначаюць некаторыя спецыялісты, з метадалагічнага пункту гледжання, даследаванні спорту ў апошнія дзесяцігоддзі знаходзяцца ў стане «парадыгматычнай нестабільнасці» [2, с. 117]. Пры гэтым дадзеная «нестабільнасць» бачыцца ў наяўнасці пэўнай колькасці тэорый, якія прымаюцца ў якасці метадалагічных асноў сучасных даследаванняў спорту і фізічнай культуры ў цэлым. Прычына шматлікасці падыходаў і праграм даследаванняў – у вызначэнні аб’екта, якім могуць быць: чалавечае цела і яго характарыстыкі, фізічны стан чалавека і ўздзеянне на яго, працэс фізічнага развіцця і выхавання людзей, заняткі разнастайнымі відамі спартыўнай дзейнасці і інш.

Аналіз матэрыялаў Еўрапейскай калегіі спартыўнай навукі паказвае, што на штогадовых кангрэсах гэтай калегіі дамінуюць даклады па фізіялогіі спорту, пачэснае месца займаюць даклады па біямеханіцы, сацыялогія спорту – на пятым месцы, педагогіка спорту – толькі на дзесятым, а гісторыя – на дзевятнаццатым. Гэта значыць, што прэвалююць біямедыцынскія даследаванні спорту, і гэта справядліва з пункту гледжання сацыяльнага запросу адносна практычных высноў і рэкамендацый. Разам з тым, гэта не здымае актуальнай задачы распрацоўкі канцэпцыі фізічнай культуры, якая б упісалася ў агульную тэорыю культуры і стала б асновай абгрунтавання годнага месца спорту ў сучасным свеце. На філасофска-антрапалагічныя даследаванні таксама маецца сацыяльны заказ, абумоўлены праявамі антрапалагічнага крызісу ў сучасным свеце.

Фізічная культура, як вызначаецца ў нашым Законе, гэта «составная часть общей культуры, сфера социально-культурной деятельности, представляющая собой совокупность духовных и материальных ценностей, создаваемых и используемых обществом в целях физического развития человека, совершенствования его двигательной активности, направленная на укрепление его здоровья и способствующая гармоничному развитию личности», а спорт – «социально-культурная деятельность, осуществляемая в форме соревнований и подготовки к участию в соревнованиях» [3]. Гэтыя вызначэнні фізічнай культуры і спорту, прадстаўленыя ў артыкуле 1 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб фізічнай культуры і спорце», можна назваць інструментальнымі, паколькі сэнс адпаведных тэрмінаў зводзіцца да інструментальнай ролі фізічнай культуры і спорту ў адносінах да іншых сфер дзейнасці і культуры ў цэлым. Такі падыход, па нашым меркаванні, не

выяўляе сапраўднай ролі і значэння спорту ў сацыякультурным быцці чалавека і грамадства, а адпаведныя паняцці не маюць філасофска-антрапалагічнага статусу. Адзін з вядомых расійскіх аўтараў вызначае такі стан як «проблемную ситуацию, связанную с необходимостью разработки сущностного определения спорта», якая і стварае магчымыя напрамкі пошуку такога вызначэння [4].

Адзін з гэтых напрамкаў фундаваны цялесна-арыентаваным падыходам (the embodied cognition approach), які ў апошнія дзесяцігоддзі стаў актуальным у сацыяльнай філасофіі і сацыягуманітарным навуковым пазнанні [5]. Гэты падыход інтэнсіўна развіваецца з канца 1980-х – пачатку 1990-х гг. XX ст. у эпістэмалогіі і кагнітыўных навуках, факусіруючы ўвагу даследчыкаў на «ацялесненасці» працэсу пазнання, цялеснай дэтэрмінацыі духоўнай актыўнасці чалавека наогул. Фундамент гэтай канцэпцыі быў закладзены біёлагам, нейрафізіёлагам і філосафам Франсіскам Варэлай. Увядзенне цела як аб'екта ў сферу філасофіі і сацыягуманітарнага пазнання, а таксама распрацоўка паняцця цялеснасці дазваляюць убачыць у фізкультурна-спартыўнай дзейнасці асобую форму актыўнасці чалавека, якая ўяўляе сабой базіс і, разам з тым, інтэгральнае выражэнне яго культурных дасягненняў – як грамадства, так і асобы. Адпаведна, спорт неабходна разглядаць як адзін з сістэмаўтваральных чыннікаў, якія вызначаюць агульную стратэгію дынамікі культурна-цывілізацыйнага працэсу. Вынікам такога падыходу з'яўляецца вызначэнне фізкультурна-спартыўнай дзейнасці як культурабудавання і чалавекатворчасці. З такога пункту гледжання фізічная культура і спорт, фізкультурна-спартовая дзейнасць цалкам выступаюць адным з базісных элементаў культуры.

Культура, калі даць яе інтэгральнае вызначэнне, уяўляе сабой сукупнасць праграм чалавечай дзейнасці і вынікаў гэтай дзейнасці па ўсіх кірунках – гаспадарча-эканамічным, палітычным, маральным, рэлігійным, мастацкім і інш. І сярод гэтых праграм дзейнасці – спорт, які ў сваім функцыянаванні адлюстроўвае дасягненні іншых шматлікіх праграм дзейнасці – ад эканомікі да навукі і рэлігіі. Акрамя гэтага, менавіта спорт з'яўляецца яшчэ і тым сацыякультурным феноменам, які ўвасабляе імкненне чалавека да спаборніцтва і канкурэнцыі ў «чыстым выглядзе» – як імкненне да перамогі і над праціўнікам у чэсным спаборніцтве, і над самім сабой. Такія перамогі вядуць да выхаду чалавека за межы свайго быцця, тым самым пашыраючы гэтыя межы. У гэтым і заключаецца сапраўдная культураствральная сутнасць спорту і яго чалавекатворчая функцыя.

Гэтыя сутнасць і функцыя праяўляюцца ў гісторыі чалавечага грамадства не адразу. Мы ведаем, што спорт з'яўляецца ў культуры як дадатковы феномен, элемент раскошы – для забавы элітных страт, для баўлення вольнага часу. Як элемент культа, як падрыхтоўка да ваенных дзеянняў ці, наадварот, як сродак пазбегнуць гвалтоўных дзеянняў – «выпусціць пару» грамадства і г. д. Аднак спорт пры такім падыходзе выконвае ролю сродка, інструмента для абслугоўвання іншых сфер дзейнасці, з'яўляецца другаснай дзейнасцю ў адносінах да іх і ад іх залежнай. Такое паняцце спорту, разам з адпаведнай трактоўкай яго паходжання, сутнасці і функцый, застаецца ў межах інструментальнага падыходу.

Гэты падыход далёка не вычарпаў сваіх магчымасцей у даследаванні спорту і фізічнай культуры наогул. Менавіта ў рамках гэтага падыходу мы фіксуем той факт, што дасягненні ў спорце, яго развіццё або заняпад таго ці іншага віду спорту, нацыянальныя прыярытэты і асаблівасці развіцця тых ці іншых відаў спорту – усё гэта з'яўляецца інтэгральным, абагульняючым адлюстраваннем эканамічных магчымасцей грамадства, яго навуковых дасягненняў, палітычных мэтаў, нацыянальных менталітэтаў і ідэалагічных дактрын, а таксама і іншых сацыякультурных чыннікаў. У межах гэтага падыходу ставяцца і вырашаюцца такія гістарычныя і сацыяльна-філасофскія праблемы спорту, як: праблема станаўлення і афармлення нацыянальных прыярытэтаў у спорце, праблема іх залежнасці ад палітычных і маральных каштоўнасцей, ад традыцый і гендарных роляў у грамадстве, праблема эканамічнай і навуковай абумоўленасці спартыўных дасягненняў, інтэгральным колькасным выражэннем чаго з'яўляецца, напрыклад, колькасць алімпійскіх медалёў.

Разам з тым, сучасныя даследаванні фізкультурна-спартыўнай дзейнасці ўсё больш імкнуцца да выхаду за межы інструментальнага падыходу. У гэтым плане асаблівае месца належыць абгрунтаванай у рамках цялесна-арыентаванага падыходу да даследавання фізкультурна-спартыўнай дзейнасці канцэпцыі спорта як культурабудавання і чалавекатворчасці. Гэтая канцэпцыя, у сваю чаргу, фундуе іншы, не інструментальны, падыход да даследавання фізічнай культуры і спорту. Яна дазваляе разглядаць фізічную культуру ў цэлым, як базісную кампаненту культуры, а ў спорце бачыць яго культураствaральную сутнасць і чалавекатворчую функцыю. Такі падыход дазваляе выявіць, апісаць і даследаваць унікальную ролю спорту ў культуры, якая звязана з самой магчымасцю выхаду чалавека за межы свайго наяўнага быцця, пашырэння сваіх цялесных якасцей і духоўных магчымасцей – у спаборніцтве з чэсным супернікам і з самім сабой. Па вялікім рахунку, менавіта ў гэтым і заключаецца сацыякультурнае вымярэнне спорту, а паняцце спорту набывае пры гэтым свой філасофска-антрапалагічны статус.

Гэтую асаблівасць спартыўна-фізкультурнай дзейнасці і дазваляе ўбачыць увядзенне цела як аб'екта ў сферу філасофіі і сацыягуманітарнага навуковага пазнання, вынікам чаго сталася распрацоўка паняцця цялеснасці. У сучасным сацыягуманітарным навуковым пазнанні дыскурс цела, цялеснасці і цялесных практык набыў пэўную папулярнасць, аднак не заняў пакуль свайго годнага месца ў якасці метадалагічнай устаноўкі даследаванняў фізічнай культуры і спорту. Разам з тым, паняцце чалавечай цялеснасці, з пункту гледжання шматлікіх спецыялістаў, можа выканаць ключавую ролю ў сінтэзе прыродазнаўчага і гуманітарнага пазнання ў даследаваннях чалавека і грамадства. Гэты сінтэз, тэарэтычна абгрунтаваны ў філасофскай антрапалогіі і постмадэрнісцкай філасофіі, паўстае як актуальная практычная праблема ў культуралагічных, сацыялагічных і педагагічных даследаваннях фізічнай культуры і спорту.

Канстатуючы актуальнасць паняцця чалавечай цялеснасці ў дыскусіях, напрыклад, пра будучыню чалавецтва, неабходна зафіксаваць важнасць гэтага па-

няцця ў пераадоленні еўрапейскага дуалізму цела і духу ў сучаснасці, у прыватнасці, у метадалогіі сацыягуманітарнага навуковага пазнання. У паняцці чалавечай цялеснасці аб'ядналася мноства сэнсаў: цялеснасць – гэта і сацыякультурнае цела чалавека; гэта і фенаменальнае цела, якое імкнецца да выхаду за межы свайго прыроднага быцця, экзістэцыял; гэта і адлюстраванне патрэб цела ў культуры і сацыяльнай рэчаіснасці; нарэшце, гэта і спосаб упісвання чалавека ў свет, ці, у тэрміналогіі канструктывізму, утварэнне ўласнага, чалавечага, свету. Усе гэтыя кампаненты, адценні паняцця цялеснасці атрымалі адлюстраванне ў шматлікай філасофскай літаратуры апошніх дзесяцігоддзяў, якая прадстаўляе розныя філасофскія школы і кірункі – ад экзістэнцыялізму да постструктуралізму, постмадэрнізму і радыкальнага канструктывізму.

Постструктуралізм і постмадэрнізм радыкальным чынам завяршылі дэрацыяналізацыю чалавека і звярнулі ўвагу даследчыкаў на абумоўленасць яго розуму і пазнання цялеснымі рэаліямі чалавечага быцця. Пры гэтым пошукі падстаў даследаванняў у гэтым кірунку вяліся ў «фенаменалогіі цела», у канцэпцыі аўтапаэзісу і радыкальнага канструктывізму, факусіраваліся вакол ідэі індывіда як істоты, якая валодае цялеснасцю і свабодай выбару, здольнасць якой да пазнання непарыўна звязана з яго прыроднай арганізацыяй і індывідуальным быццём. Валодаючы непасрэдным, неадчужальным ад цела ведамі-быццём, якое забяспечваецца менавіта цялесным кантактам са светам (успрыманне – у М. Мерло-Понці [6]), індывід здольны здзяйсняць аўтапаэзіс – самаўтварэнне ўласнага жыцця.

Назапашванне «досведу быцця целам», сэнсаў, замацаваных у сацыякультурных знаках, вядзе да замацавання ўстойлівых сэнсавых канструкцый, канструяванню сацыякультурнай рэчаіснасці, якая, у сваю чаргу, абумоўлівае ўзаемадзеянне індывіда са светам на ўзроўні першасных цялесных практык. Пры гэтым самі сэнсы ствараюцца на падставе цялесных практык па ўпісванні чалавечага свету ў свет аб'ектыўнай рэчаіснасці. Кожны індывід не пачынае сваё ўзаемадзеянне са светам «з нуля» – ён пачынае з раскадзіравання культуры і разумення сэнсаў на ўзроўні цялесных практык. Раскадзіроўка індывідам гэтых культурных сэнсаў на ўзроўні цялесных практык не з'яўляецца абавязковай: сацыякультурныя сэнсы ўжо ўпісаны ў цела і праяўляюцца ў манерах, стылях, звычках гаварыць, трымацца, рухацца, падпарадкоўвацца пэўным інкарпараваным патрабаванням – гэта значыць праяўляюцца ў цялеснасці [7, 8].

Для спартыўнай педагогікі дадзеная метадалагічная пазіцыя мае асаблівую значнасць, паколькі яна падкрэслівае прынцыповае адзінства розуму і цела, неразчлянёнасць суб'екта і аб'екта ў экзістэнцыяльным быцці чалавека, разуменне цела як умовы і неабходнай кампаненты гэтага быцця, а самой цялеснасці як экзістэнцыялу. Чалавечая цялеснасць мае свае біялагічнае паходжанне, але не з'яўляецца гарантам прысутнасці чалавечага ў чалавеку. Яна становіцца па-сапраўднаму чалавечай толькі ва ўмовах пасяховай спробы выхаду індывіда за межы біялагічнага цялеснага досведу. З такога пункту гледжання спартыўнай дзейнасць прадстае як рэалізацыя чалавекатворчай функцыі культуры.

Разгледжаны з боку аб'ектыўнага зместу спартыўнай дзейнасці спорт выступае як частка не толькі фізічнай культуры, але і культуры ў цэлым. А гэта значыць, што, нягледзячы на аўтаномію свайго існавання і развіцця, спорт «разамкнёны» на культуру як цэласнае і сістэмнае ўтварэнне, зарыентаваны на яе і сугучны яе каштоўнасцям і мэтам, рэалізуючы функцыю чалавекатворчасці. Вызначэнне ў спорце гранічных магчымасцей, якімі валодае чалавечая цялеснасць – частка гэтай функцыі. Разам з тым, фізічная культура ў цэлым выступае як аснова захавання і трансляцыі каштоўнасцей чалавечай цялеснасці.

*Заключэнне.* Філасофска-антрапалагічны статус паняццяў фізічнай культуры і спорту, выяўлены на падставе цялесна-арыентаванага падыходу да іх даследавання, дазваляе вызначыць іх сапраўдную ролю ў сучаснай культуры. Фізічная культура як сукупнасць праграм дзейнасці, накіраванай на падтрымку чалавечай цялеснасці і трансляцыю яе каштоўнасцей, увасабляе традыцыю, а спорт у яе складзе ўвасабляе развіццё – навацыю. Разам яны, фізічная культура і спорт, выступаюць гарантамі захавання Чалавека і яго цялеснасці ў яго супрацьстаянні звыштэхналогіям і «постчалавеку» ва ўмовах сучаснага антрапалагічнага крызісу.

*Літаратура*


1. Энцыклапедыя электронная. – Рэжым доступу: http://www.slounik.org/155627.html. – Дата доступу: 24.03.2020.
2. *Ласкене, С.* Возможности анализа спорта как социального феномена / С. Ласкене, В. Чингене // Социологические исследования. – 2007. – № 11. – С. 117–125.
3. Закон Республики Беларусь от 4 января 2014 г. № 125-З «О физической культуре и спорте». – Глава 1. Общие положения // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 21.01.2014, 2/2123. – Дата доступа: 24.03.2020.
4. *Передельский, А. А.* Физическая культура и спорт в отражении философских и социологических наук / А. А. Передельский. – М. : Спорт, 2016. – С. 259.
5. *Бескова, И. А.* Природа и образы телесности / И. А. Бескова, Е. Н. Князева, Д. А. Бескова. – М. : Прогресс-Традиция, 2011. – С. 16.
6. *Мерло-Понти, М.* Феноменология восприятия / Пер. с фр. под ред. И. С. Вдовиной, С. Л. Фокина / М. Мерло-Понти. – СПб. : Ювента: Наука, 1999.
7. *Бурдье, П.* Практический смысл: Пер. с фр. / П. Бурдье ; общ. ред. пер. и послесл. Н. А. Шматко. – СПб., М., 2001.
8. *Слотердайк, П.* Микросферология : в 3 т. / П. Слотердайк. – СПб. : Наука, 2005. – Т. 1. Пузыри.


*References*


1. Encyklapedyya elektronnaya. – Rezhym dostupu: http://www.slounik.org/155627.html. – Data dostupu: 24.03.2020.
2. *Laskene, S.* Vozmozhnosti analiza sporta kak social'nogo fenomena / S. Laskene, V. Chingene // Sociologicheskie issledovaniya. – 2007. – № 11. – S. 117–125.
3. Zakon Respubliki Belarus' ot 4 yanvarya 2014 g. № 125-Z «O fizicheskoj kul'ture i sporte». – Glava 1. Obshchie polozheniya // Nacional'nyj pravovoj Internet-portal Respubliki Belarus', 21.01.2014, 2/2123. – Data dostupa: 24.03.2020.
4. *Peredel'skij, A. A.* Fizicheskaya kul'tura i sport v otrazhenii filosofskih i sociologicheskih nauk / A. A. Peredel'skij. – M. : Sport, 2016. – S. 259.
5. *Beskova, I. A.* Priroda i obrazy telesnosti / I. A. Beskova, E. N. Knyazeva, D. A. Beskova. – M. : Progress-Tradiciya, 2011. – S. 16.
6. *Merlo-Ponti, M.* Fenomenologiya vospriyatiya / Per. s fr. pod red. I. S. Vdovinoj, S. L. Fokina / M. Merlo-Ponti. – SPb. : Yuventa: Nauka, 1999.
7. *Burd'e, P.* Prakticheskij smysl: Per. s fr. / P. Burd'e ; obshch. red. per. i poslesl. N. A. Shmatko. – SPb., M., 2001.
8. *Sloterdajk, P.* Mikrosferologiya : v 3 t. / P. Sloterdajk. – SPb. : Nauka, 2005. – T. 1. Puzyri.